УДК 947.6 «19» – 058.12

П. В. Дзядзюля, дацэнт

# СТАНАЎЛЕННЕ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

The article presents an analysis of contradictory process of formation of the intellectuals stratum in Belarus during the period of bourgeois reforms in the Russian Empire.

Пашырэнне адукацыі, імкненне людзей пазнаваць нязведанае, развіццё мастацтваў, патрэбы вытворчасці пасля адмены прыгону ў Расійскай імперыі прывялі до росту сацыяльна-прафесійнай групы людзей, якія займаліся пераважна разумовай працай. У той ці іншай ступені яны неслі вынікі адукаванасці ў народ, ствараючы духоўныя каштоўнасці, скіроўваючы людзей на шлях прагрэсу.

Тэрмін «інтэлігенцыя» (з лацінскай – разумны, дасведчаны) з'явіўся ў 60-я гады XIX ст. у творах рускага пісьменніка Бабарыкіна П. Д., які ці не ўпершыню ў Расіі ў сваіх шматлікіх творах паказваў буржуазію, развіццё пралетарыята, інтэлігенцыі [1].

Новыя паслярэформенныя расійскія рэаліі стварылі адносна спрыяльныя ўмовы для росту ўсіх груп інтэлігенцыі. Агульнавядомыя дасягненні літаратуры, усіх жанраў мастацтва, сістэмы асветы. Рускія інжынеры ў большасці сваёй па творчых дасягненнях сталі ўпоравень з заходнееўрапейскімі.

І ў той жа час поліэтнічная імперыя праводзіла дыскрымінацыю нацыянальных меншасцяў. Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. у Паўночна-Заходнім краі быў устаноўлены рэжым надзвычайных законаў, згодна якіх праводзілася татальная русіфікацыя.

У 1864 г. за ўдзел студэнтаў і выкладчыкаў у паўстанні быў ліквідаваны Горы-Горацкі земляробчы інстытут, які пакінуў значны след у гісторыі айчыннай сельскагаспадарчай навукі, даўшы шэраг выдатных выпускнікоў. На Беларусі не засталося вышэйшых навучальных устаноў. Неаднаразовыя звароты грамадскасці краю ў Пецярбург з просьбай арганізаваць у адным з губернскіх гарадоў універсітэт ігнараваліся.

Сістэма народнай асветы па ўсіх паказчыках была неадэкватнай патрэбам часу. Не здавальняючая матэрыяльная база школ, мізэрнае іх фінансаванне, нязначны ахоп навучаннем дзяцей, адсеў вучняў на працягу навучальнага года, нізкая кваліфікацыя настаўнікаў.

У пачатку XX ст. ва ўрадавых, прыватных класічных і рэальных гімназіях краю навучалася ўсяго 31 328 чалавек. І толькі невялікая колькасць іх магла вучыцца ў расійскіх ці замежных ВНУ. Вядома, што не ўсе яны вярталіся на Радзіму [2].

Адносна масавай праслойкай былі настаўнікі, якіх рыхтавалі 9 настаўніцкіх семінарый і 3 інстытуты. Настаўніцкія інстытуты не мелі статуса вышэйшай навучальнай установы, аднак праграма навучання ў іх была на той час самай дасканалай у Беларусі.

Семінарыі, інстытуты не далі бясследна знікнуць многім таленавітым беларусам. Сярод іх Якуб Колас, Кузьма Чорны, Міхась Чарот, Янка Журба, Сянкевіч А. А., Гарбацэвіч В. С., Забейда-Суміцкі М. І. і многія іншыя. Але не ўспрыняцце беларусаў на афіцыйным узроўні самастойным народам, барацьба з так званым польскім уплывам, рэпрэсіі супраць вольнадумства вымывалі найбольш здольных, адукаваных, смелых, нацыянальна свядомых. Турмы, ссылкі, эміграцыя – такі лёс чакаў многіх беларусаў, якія хацелі людзьмі звацца.

І ў той жа час стрымаць, спыніць інтэлектуальнае развіццё беларусаў, рост іх нацыянальнай самасвядомасці адміністрацыйна-карнай машыне імперыі не ўдалося.

Сярод тых, хто ў неспрыяльных умовах будзіў беларусаў ад летаргічнага сну быў ураджэнец вёскі Шыпілавічы Бабруйскага павета, вялікі патрыёт, сапраўдны інтэлігент, выпускнік Мінскай духоўнай семінарыі Павел Міхайлавіч Шпілеўскі. Этнограф, фальклярыст, публіцыст, тэатральны крытык, кандыдат багаслоўя супрацоўнічаў з Пецярбургскімі перыядычнымі выданнямі. Адзін з першых даследыкаў і папулярызатараў беларускай гісторыі, этнаграфіі, фальклору.

У той час, калі нават паняцце «Беларусь» было забаронена, Шпілеўскі заявіў на ўвесь голас: « Ёсць у нас на Русі вялікі край ... яго завуць Беларуссю. Жывуць там людзі беларускія, нашчадкі старажытных крывічоў. Край гэты багаты сваімі самабытнымі звычаямі, міфалогіяй, мовай і, нарэшце, гульнямі і святамі» [3].

Абуджалі, духоўна ўзбагачалі забыты беларускі народ, вывучаючы быт, мову, культуру, прапагандуючы яго самабытнасць цэлая плеяда вучоных, сярод якіх удумлівыя даследчыкі, самаахвярныя інтэлектуалы А. Семянтоўскі, І. Насовіч, Е. Раманаў, М. Нікіфароўскі, Ю. Крачкоўскі, А. Багдановіч, П. Шэйн і інш. Яны сказалі свету новае слова пра беларусаў, якое падхапілі наступныя пакаленні вучоных, літаратараў, палітыкаў [4].

Стымулам далейшага росту інтэлігенцыі стаў народніцкі рух у Расіі, які захапіў і Беларусь. Аўтары і прыхільнікі ідэйна блізкага да

народнікаў часопіса «Гоман» лічылі інтэлігенцыю галоўнай сілай у абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці, у нацыянальным і сацыяльным вызваленні народа.

Ідэі народніцтва падзялялі Каліноўскі К., Серакоўскі З., Урублеўскі і іншыя ўдзельнікі паўстання 1863–64 гг. У 1874–84 гг. у Пецярбургскіх, Маскоўскіх і некаторых перыферыйных ВНУ дзейнічалі нелегальныя групы беларускіх студэнтаў, якія падтрымлівалі сувязь з Беларуссю, дзе вялі прапаганду народніцкіх ідэй. Групы беларускіх народнікаў нелегальна выдавалі адозвы: «Да беларускай інтэлігенцыі», «Пасланне да землякоў-беларусаў» і інш. [5].

Згодна надзвычайным законам расійскія імперскія сілы праследавалі не толькі рэвалюцыйную дзейнасць у Паўночна-Заходнім краі, але і забаранялі любое праяўленне беларускасці. Аналізуючы гэты перыяд Максім Багдановіч зрабіў вывад, што ніякага беларускага руху тут не было, а нацыянальная свядомасць не магла развіцца ў народзе без дапамогі ўласнай інтэлігенцыі [6].

Заўважаны ў сімпатыях да паўстанцаў В. Дунін-Марцінкевіч знаходзіўся пад наглядам паліцыі і з вялікай асцярогай працягваў творчую працу. Пераклаў на беларускую мову твор А. Міцкевіча «Пан Тадэуш», у сваім маёнтку Люцынка каля Ракава арганізаваў школу для дзяцей сялян і беднай шляхты [7].

Створанае В. Дуніным-Марцінкевічам, С. Манюшкам, Ф. Тапчэўскім і інш. творчае асяроддзе пачало пашырацца вынікамі працы многіх беларусаў, якія ўсё больш усведамлялі неабходнасць ратавання занядбанага народа праз далучэння яго да гісторыі, культуры. Пераадолеўшы не малыя цяжкасці яны паасобку і калектыўна фарміравалі беларусазнаўства, друкавалі вынікі сваіх даследаванняў этнаграфіі, фальклору, філалогіі, пісалі арыгінальныя творы. Сярод іх з'яўлялася ўсё больш людзей высокаадукаваных, засвоіўшых багатую культуру Заходняй Еўропы, Расіі [8].

Паэт Янка Лучына закончыў Пецярбургскі тэхналагічны інстытут, працаваў у Тыфлісе, потым у Мінску. Пісаў вершы, публіцыстыку на беларускай, польскай, рускай мовах. Збіраў фальклор, падтрымліваў сувязі з М. Доўнар-Запольскім, перакладаў з польскай, рускай, нямецкай моў [9].

У Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце пасля заканчэння Віленскага рэальнага вучылішча пачынаў асвойваць тэхнічныя навукі Адам Гурыновіч. У студэнцкія гады займаўся літаратурай, у гэты перыяд напісаў свае лепшыя творы. Усебакова адораны малады чалавек вывучаў філасофію, на канікулах падарожнічаў па родным краі, запісваў народныя песні, прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху [10 ].

Сярод тых, хто самаахвярна працаваў для Беларусі, было не мала людзей, якія выйшлі са шляхецкага саслоўя, атрымалі выдатную адукацыю, мелі высокі сацыяльны статус у грамадстве. Чалавекам энцыклапедычных ведаў быў Аляксандр Ельскі, род якога ўзыходзіў у далёкай мінуўшчыне. Першапачатковую адукацыю атрымаў дома, закончыў Мінскую класічную гімназію, нямецкую школу ў Прусіі. Служыў у войску, ваяваў у Крымскай вайне. Пакінуў службу і пасяліўся ў спадчынным маёнтку Замосце (цяпер Пухавіцкі р-н).

Пісьменнік, публіцыст, літаратуразнавец, гісторык, этнограф, фалькларыст, збіральнік айчынных помнікаў пісьменства і гісторыі. Стварыў музей старажытнасцяў, найперш беларускіх. Перапісваўся з тымі, хто так ці інакш быў звязаны з гісторыяй і культурай Беларусі. У маёнтку знаходзіліся рэдкія беларускія стадрукі, летапісы, хронікі, геаграфічныя карты, усе выданні Статута ВКЛ, прыжыццёвыя выданні і рукапісы А. Міцкевіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Кіркора, запісы беларускага фальклора. Для азнаямлення са зборамі культурных каштоўнасцяў у Замосце прыязджалі знакамітыя дзеячы навукі і культуры розных краін [11].

Яркім інтэлігентам свайго часу, чалавекам высокай культуры быў Ф. Багушэвіч. Выхадзец са збяднелай шляхецкай сям'і ўсё жыццё вучыўся і веды свае аддаваў народу. Як ніхто іншы ён найбольш адпавядаў крытэрыям, якія крыху пазней сфармуляваў М. Багдановіч: інтэлігент той, хто імкнецца да ведаў і хто нясе свае веды на карысць народу [12].

Студэнт, настаўнік, паўстанец, паэт, юрыст. У судзе абараняў простых людзей, якія за яго самаахвярную працу часам плацілі толькі сардэчным словам падзякі. Ён усёй душой хацеў нацыянальнага адраджэння і сацыяльнай перабудовы, а таму і заклікаў: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!» [13].

Багушэвіч Ф. І яго творчасць у значнай ступені прадвызначылі з'яўленне цэлай плеяды нашаніўцаў і не толькі пісьменнікаў.

Творчы патэнцыял народа шукаў і знаходзіў выйсце ў прыродазнаўчых, дакладных навуках. Сусветная навукова-тэхнічныя адкрыцці XIX – пачатку XX ст. закранулі і Беларусь. Адсутнасць навукова-даследчых цэнтраў, вышэйшых навучальных устаноў не з'яўлялася перашкодай для беларускх прыродазнаўцаў, матэматыкаў, хімікаў чытаць еўрапейскую, расійскую перыёдыку, праводзіць даследаванні ў прыватных, гімназічных кабінетах і лабараторыях, удзельнічаць у навуковых канферэнцыях.

Агульнанавуковая падрыхтоўка ў гімназіях дазваляла выпускнікам вытрымліваць экзамены і паспяхова вучыцца ў вышэйшых навучальных

установах Германіі, Расіі, Аўстрыі, Польшчы і іншых краін. Многія з іх па заканчэнні ВНУ шукалі лепшых умоў на чужыне, некаторыя лічылі сябе палякамі, рускімі, украінцамі, але нейкая частка моладых людзей, атрымаўшы адукацыю, вярталася на Радзіму.

Адным з іх быў Уладзіслаў Дыбоўскі, які нарадзіўся ў маёнтку Адамарын Мінскага павета, вучыўся ў Мінскай гімназіі, па заканчэнні Дэрпцкага універсітэта атрымаў навуковую ступень кандыдата прыродазнаўчых навук. За ўдзел у паўстанні 1863 – 1964 гг. правёў некалькі гадоў у турме.

Вярнуўся ў 1871 г. у Дэрпт, дзе паспяхова займаўся навуковай, педагагічнай дзейнасцю. Вынікі яго даследаванняў становяцца шырока вядомымі. Ён наведвае акадэмічныя цэнтры Германіі, Расіі, дзе яго даклады, паведамленні атрымлівалі высокую ацэнку. Па стану здароўя ён пераязджае ў маёнтак Нянькаў, што ў 20 км. ад Навагрудка, апошнія гады свайго жыцця праводзіць у Войнаве. Тэмп яго навуковай дзейнасці тут паскараецца. Даследчык еўрапейскага ўзроўню ў прыродазнаўстве ён цікавіцца беларускімі назвамі раслін, піша артыкул «Літоўскія расліны ў паэзіі Адама Міцкевіча».

У. Дыбоўскі меў выдатныя лігвістычныя здольнасці. Ведаў 6 моў. З беларусам мог свабодна размаўляць па-беларуску, а з яўрэям – па мясцовым яўрэйскім дыялекце. Апублікаваў два зборнікі загадак і прымавак, сабраных у Навагрудскім павеце [14].

Толькі неардынарныя маладыя людзі ў тых неспрыяльных умовах маглі паспяхова вучыцца ва універсітэтах і сказаць важкае слова ў навуцы. Адным з іх быў таленавіты вучоны – фізік з-пад Ашмян, выпускнік Казанскага універсітэта Кароль Чаховіч. Працуючы выкладчыкам фізікі ў Віленскім шляхецкім інстытуце, Беластоцкай рэальнай гімназіі ён вёў шматгранную навуковую работу па розных раздзелах фізікі, метэаралогіі, канструяваў прыборы, афармляў лабараторыі, быў членам вядучых навуковых таварыстваў, членам-карэспандэнтам Галоўнай фізічнай абсерватолрыі, выдаўцом першага ў Расіі навуковага фізіка-матэматычнага часопіса [15].

Беларусь дала свету шэраг выдатных матэматыкаў, імёны якіх залатымі літарамі запісаны ў гісторыю навукі – Соф'я Кавалеўская, Мінкоўскі Герман, Брайцаў Іван, Доўбня Іван, Марцінкевіч Язэп і інш.[16 ].

Французскі мысліцель П. Паскаль у свой час заўважыў, што калі Францыю пакінуць 300 выдатных людзей, то яна пераўтворыцца ў краіну дурняў. Крыху грубавата, але дакладна. Інтэлект ва ўсе часы вызначаў месца краіны ў свеце, накіроўваў дзяржаву да новых вышынь прагрэсу. Беларусы на значным адрэзку сваёй гісторыі па розных прычынах гублялі таленавітых людзей і гэта стала адной з галоўных прычын таго сумнага становішча, у якім еўрапейскі народ апынуўся.

## Літаратура


1. Краткая литературная Энциклопедия. Т. 1. – Минск, 1962. – С. 648–649.
2. Снапкоўская С. В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. – Минск, 1998. – С. 13, 18.
3. ЭГБ: у 6 т. Т. 6, кн. 1. – Мн., 2003. – С. 229.
4. Доўнар- Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі // Беларуская энцыклапедыя. – Мн., 1994. – С. 396–402.
5. ЭГБ: у 6 т. Т. 5. – Минск, 1999. – С. 287.
6. Багдановіч М. Белорусское возрождение // Поўны збор твораў: у 3 т. Т. 2. – Минск: Навука і тэхніка, 1995. – С. 265–270.
7. Ядвігін Ш. Выбраныя творы. – Минск: Мастацкая літаратура, 1976. – С. 297.
8. Гарэцкі Максім. Гісторыя беларускай літаратуры. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1992. – С. 238–239.
9. ЭГБ: у 6 т. Т. 4. – Минск: Беларускі кнігазбор, 2004. – С. 5–6.
10. ЭГБ: у 6 т. Т. 3. – Минск, 1996. – С. 178–179.
11. Ельскі А. Выбранае. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. – С. 5–6.
12. Багдановіч М. Поўны збор твораў: у 3 т. Т. 3. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – С. 15.
13. Багушэвіч Францішак. Творы. – Мінск: Беларусь, 1967. – С. 17.
14. Галакціёнаў С. Г., Яцкевіч Г. М. Рыцар навукі з Нянькава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – С. 10, 43.
15. Працька Т. С. Эксперыментатар з Беластоцкай гімназіі. – Минск: Навука і тэхніка, 1990. – С. 4, 18, 28.
16. Дабравольскі В. А. Да ісціны найпрацейшым шляхам. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – С. 4, 6, 57.